**Нуждзіна Т.С. (Мазыр)**

# Ён сэрцам глядзеў на свет: дакументальна-эсэістычная проза Янкі Сіпакова

Культура, інтэлектуальнае жыццё краіны постсавецкай эпохі засведчыла асаблівую цікавасць у чытацкім і навукова-творчым асяроддзі да мастацка-дакументальнай літаратуры (мемуары, дзённікі, эпісталярый, эсэістыка), што абумоўлена многімі прычынамі. І найперш увагай і чытачоў, і даследчыкаў-навукоўцаў да праўды факта, да непасрэдных аўтарскіх прызнанняў, ацэнак, асабістых каментарыяў творцы адносна дачыненняў з жыццёвым матэрыялам, прыродай таленту, творчым працэсам і побытавай штодзённасцю. Словам, падобная літаратура – гэта ключ не толькі да разгадкі сакрэтаў і таямніц мастакоўскага самавыяўлення, але і да разумення душы Творцы.

Актыўнае функцыянаванне ў беларускай літаратурна-творчай прасторы XXI ст. выдатнай эсэістыкі – з’ява не толькі відавочная, але і заканамерная. Сведчанне гэтаму – мастацкі вопыт Янкі Сіпакова на шляху асваення ім прынцыпаў эсэістычнага пісьма. У гутарцы з З. Прыгодзічам пісьменнік прызнаўся, што ў рэчышчы аўтабіяграфічнай прозы пачаў працаваць з 1974 г., апрабоўваючы розныя жанры – запісы, мініяцюры, роздум. Пазней, сабраўшы падобны матэрыял пад адной вокладкай, абазначыў па-свойму, як гэта ўласціва толькі яму, Сіпакову, і жанравую прыроду кнігі: «Гэта своеасаблівы дзённнік. Не звычайны нататнік, у які запісваюцца кожны дзень думкі і разважанні, а апасродкаваны водгук на тое, што адбывалася ўчора і тысячы гадоў назад. Гэта дзённік душы. Ці нават – жыцця. Я ж сам яго называю дзённікам настрою» [4, с. 183].

У дыялогу з Л. Рублеўскай пісьменнік заклапочана гаварыў пра такія глабальна важныя і нязменныя мэты сучаснай і будучай літаратуры свету, як «вывучаць і даследаваць словам, пачуццём чалавека і свет, у якім ён жыве і ў якім мог бы жыць». Акрэсліць пры гэтым і першасную адметнасць («прыватнасць») беларускай літаратуры «як найпаўней выразіць, паказаць сваю зямлю, свой народ, яго душу, бо ніхто ў свеце лепей і дакладней за нас не зробіць. Каб свет, пазнаёміўшыся з нашай літаратурай мог сказаць: “Дык вось якія яны, беларусы!”» [3, с. 66–67]. Гэтак жа захоплена марылася ў сярэдзіне 1950-х гг. і настаўніку-паэту У. Караткевічу, калі ў лістах да М. Танка дзяліўся сваімі творчымі намерамі адкрыць беларусу яго гістарычнае мінулае, дапамагчы яму спасцігнуць самога сябе і паказаць свету гістрычную самасць беларуса.

У артыкуле «Пра Янку Сіпакова ў самым агульным плане» (1996) паэт, навуковец Н. Гілевіч вызначыў у мастацкім характары пісьменніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наступнае: давер і павага да жыцця, любоў і дабрыня да чалавека, да людзей і нарэшце «давер і павага да самога сябе, да свайго таленту і густу. А гэта само не прыходзіць. Гэта здабыта вялікім жыццёвым і творчым вопытам» [2, с. 305-306]. Правамерным будзе падобнае меркаванне і ў дачыненні да таго, як, напрыклад, класіфікаваў свае мастацкія набыткі творца, рыхтуючы да выдання кнігу «Пяць струн»: так абазначаны пяць накірункаў рэалізацыі таленту, а яшчэ розныя рэгістры сэрцабіцця і кожны раз іншае пачуццё, новы эмацыянальны настрой – ад лірычнай струны да гумарыстычнай.

Літаратурна-творчыя, эстэтычныя канцэпцыі Я. Сіпакоў падае ў інфармацыйных запісах з адпаведнымі каментарыямі, роздумах, мініяцюрах, дыялогах-спрэчках з самім сабой, сюжэтных апісаннях сцэн, эпізодаў з літаратурнага жыцця. Пры гэтым так яднае свет сваіх думак, эмоцый, навуковых досведаў і каментарыяў у мастацкае цэлае, што ў большасці выпадкаў кнігі эсэістыкі Я. Сіпакова маюць кожны раз дадатковыя жанравыя ўдакладненні – дзённік настрою «Соты», гістарычны партрэт-эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля». Эсэ «Мая бібліятэка» – гэта кніга пра кнігі, а эсэ ў 2-м томе выбраных твораў аб’яднаны ў раздзел пад назвай «Пра што думалася на адзіноце». Прыгаданы раздзел – гэта калейдаскоп думак пра літаратуру, таямніцы таленту, пра душу творцы, пра штодзённае рашэнне глабальнай задачы «будзіць чалавека ў чалавеку» [5, с. 343].

Калісьці ўдумлівы В. Бечык, надзелены паэтычным слыхам, чуйнай душой і бездакорным эстэтычным густам, у артыкуле «Блізкая далячынь» (1972) слушна заўважыў, што «кніга «Па зялёную маланку» расказвае нам пра падарожжа душы, а ў душы свае вымярэнні і свае маштабы» [1, с. 295]. У той жа час параду крытыка чытаць згаданую кнігу пісьменніка на хвалі душэўнага з ім суперажывання варта ўспрыняць як самы эфектыўны спосаб спасціжэння мастацкай глыбіні ўсяго, што створана гэтым унікальна таленавітым сынам аршанскй зямлі. Толькі праз асабістае суперажыванне можна зразумець і «ўвабраць роздум, настрой і вопыт» [1, с. 295] творцы. І «падарожжа душы» – зусім не метафара крытыка, а сутнасць быцця Я. Сіпакова і ў жыцці, і ў творчасці. Пераконваюць у гэтым многія эсэістычныя творы пісьменніка. Тое, аб чым думалася на адзіноце, так шліфавалася, так прасейвалася праз самае густое сіта аўтарскай патрабавальнасці, што набывала амаль афарыстычную дакладнасць, ёмістасць і станавілася абсалютным паказальнікам творчай прынцыповасці і маральнай ахайнасці самога пісьменніка.

Толькі пісьменнік з выключна паэтычнай душой, які выяўляў сваё права быць у літаратуры, жыць словам з такой аголенасцю творчага нерва, мог і таленавіта створанае і іншымі майстрамі ўспрымаць так, як дыктавала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яго душа, думаючая, надзеленая тонкім густам, асобым даверам да жыццёвай канкрэтыкі і яе мастацкага перастварэння: «Люблю мазаіку. Асабліва ў прозе. Глядзіш зблізку – і здаецца, што вось гэтыя дэталі, вобразы, малюнкі – лішнія, што яны тут не трэба, а адыдзешся далей, зірнеш на ўсю карціну адразу – і ўбачыш: вунь што яно, дык гэта ж тыя лішнія дэталі – якраз вочы на малюнку. Альбо хата, у якой жывуць героі, альбо дрэва, якое яны пасадзілі перад сваімі веснічкамі…» [5, с. 342].

Паспрабуем зрабіць (хоць у нейкай ступені агледзіны таго, што калі не фрэскава, дык калейдаскапічна ўкладзена ў мастацкую структуру яго цыклічных запісаў – «Літаратурная струна», «Пра што думалася на адзіноце», «Соты»). Сістэмнае прачытанне сіпакоўскіх дзённікаў настрою пераконвае ў тым, што пісьменніку важна было найперш сэрцам пражыць і перажыць кожнае імгненне жыцця, блізкага і далёкага, сучаснага і даўно мінулага (гістарычнага), асабістага і маштабна значнага (нацыянальнага і агульначалавечага), каб пазней праўдзіва «пакласці» ў мастацкі твор асобнай карцінай, эпізодам, сцэнай, малюнкам, з якіх і складаецца панарама народнага жыцця, жыцця, якое стала падмуркам маральна-духоўнай сутнасці яго творчай Душы. Той душы, што ніколі і ні ў чым не здраджвала праўдзе – рэальнай і мастацкай, што не прымала прымітыўнай пошасці і «хлёсткага глупства чарговага графамана» [5,с. 340].

Пісьменніка не толькі здзіўляла, але і абурала тое, што нават паэт-лірык у 70-я гг. змушаны быў спавядацца няшчыра. Таму як зарок, як непарушны мастацкі прынцып, абраны раз і назаўсёды, успрымаецца наступны запіс: «Пра што б ты ні пісаў, ты павінен быць вельмі дакладны. Калі пішаш пра тое, што адчувае конь, які вязе воз, то чытач павінен верыць, што менавіта тое конь і адчувае, пра тое і думае, – якраз так, як ты і паказваеш. Хоць ты, скажам, пішаш і пра далёкае мінулае, чытач павінен быць упэўнены (дзякуючы тваёй дасведчанасці), што ты сам быў там, сам усё гэта на свае вочы бачыў» [5, с. 341].

Прынцыповасць свайго мастакоўскага крэда Я. Сіпакоў абазначыць і такой катэгарычнай назвай «Сёння і назаўсёды» эсэістычнага раздзела з кнігі «Вецер на даху вагона». Агульнавядома, што Я. Сіпакоў не імкнуўся да публічных выступленняў. Яму імпанавала творчая адзінота. Аднак тое, што передумана-перажыта на гэтай самотнай адзіноце, што адбілася ў псіхалагічна адкрытых настроях і меркаваннях, вострых ацэнках, уражвае і кранае глыбей, чым выступленне «на аўдыторыю». Узнікае адчуванне, што чытаеш вялікую, таленавітую кнігу высокамастацкай прозы, дзе галоўным героем з’яўляецца Душа, якая пакутуе і радуецца, клапоціцца, маркоціцца і часта адчувае няёмкасць або сарамлівасць. Нават тады, калі завершана работа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

над чарговым творам і кніга пайшла да чытача, зажыла сваім жыццём: «Калі ты выдаў кнігу, то робішся ўжо безабаронны, ранімы, уразлівы. Калі яе хто перад табою чытае, табе здаецца, што ўсё там не так, што ўсё не на месцы, усё не тое – кожны, здаецца, глядзіць у тваё разнасцежанае сэрца. <…>. Яна, кніга, адпачкавалася ад цябе, вядзе зараз самастойнае жыццё і, астаўшыся сам-насам з сотнямі, а то і тысячамі людзей, як умее, як ты даручыў ёй, адстойвае твае погляды, дзеліцца з людзьмі тваімі думкамі. Адна, без цябе. І тады ты разумееш, як гэта адказна – выдаць сваю кнігу…» [5, с. 341–342].

Многія запісы тлумачаць, напрыклад, як ішоў працэс выхавання ў сабе высокай патрабавальнасці да слова, вобраза-персанажа, да праўды і культуры пачуццяў. Нагадаем некаторыя з асноўных творчых установак, якім падначальваў свой талент Я. Сіпакоў. Ён лічыў, па-першае, што «твор можа адбыцца, калі ў стварэнні яго ўдзельнічае сэрца. <…> Без сэрца, хоць рэч і будзе напісана, але нікога не зможа ўсхваляваць, хоць героі і будуць народжаны, яны ніколі не змогуць стаць жывымі» [5, с. 370]; па-другое, народзіцца і гэты важны тэзіс-афарызм пра кнігу, які на поўную моц рэалізуецца ў сіпакоўскім эсэ пра кнігі – «кніга – гэта ж заўсёды роздум. Яна абавязкова змушае думаць. І я глыбока перакананы, што паўнацэнную, гарманічную асобу нельга выхаваць без кнігі, без літаратуры…» [5, с. 347]; па-трэцяе, «нават стварыўшы шэдэўр – усумніся – вось думка, якою не павінен, мусіць, грэбаваць ніводзін творца» [5, с. 347].

Усё, што перадумаў, да якіх высноў прыходзіў, усе свае думкі, сваю праўду пра народ і краіну (ідучы ад гісторыі родных Зубрэвіч), пра літаратуру, творы і творцаў ён увасобіць у дзве, як нам здаецца, самыя галоўныя кнігі свайго літаратурнага жыцця, кнігі быцця адной творчай Душы. Гэта – гістарычнае эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля» і кніга пра кнігі «Мая бібліятэка». Так, эсэ "Мая бібліятэка" – гэта, па сутнасці, мастацкае абагульненне ўсяго, што было калісьці асвоена пісьменнікам на ўзроўні яго інтэлектуальна-псіхалагічнай сутнасці.

Літаратура


1. Бечык, В. Выбранае : літ.-крытычныя артыкулы ; прадм. С. Андраюка ; уклад. Л. Кароткай / В. Бечык. – Мінск : Маст. літ., 1989.

2. Гілевіч, Н. Збор твораў : у 23 т. / Н. Гілевіч. – Мінск : ТДА "Пантограф", 2010. – Т. 15 : Проза. Нататкі розных гадоў. З блізкіх і далёкіх дарог. Забаўныя гісторыі. – 606 с.

3. З Янкам Сіпаковым гутарыць Людміла Рублеўская // Крыніца. – 1997. – № 5. – С. 66–72.

4. Сіпакоў, Я. "Гэта ж якая радасць – ствараць жыццё!" : гутарку вёў З. Прыгодзіч // Полымя. – 2007. – № 2. – С. 176–198.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

5. Сіпакоў, Я. Выбраныя творы : у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1997. – Т. 2: Проза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ